сустрэчы



# КАЗЦЫ БЫЦЬ...

“Быць пісьменнікам – цяжкая справа” – з гэтага радка пачынаецца адзін з маіх вершаў, прысвечаны пісьменнікам. І я сапраўды лічу, што пісьменнікам быць складана. Гэта толькі збоку здаецца, што мы самі сабе нешта прыдумалі, нешта запісалі і ўсё. А колькі думак трэба перадумаць, каб атрымаўся твор? А колькі намаганняў трэба прыкласці, каб зрабіць той ці іншы тэкст годным? Дакладна скажу: шмат! А акрамя напісання твораў пісьменнікі актыўна ўдзельнічаюць у культурным жыцці сваёй краіны, а часам і не толькі сваёй. За адзін год кожны пісьменнік правядзе столькі творчых сустрэч, што іншым разам іх і не падлічыш.

30 снежня 2025 года, калі ўся краіна ўжо актыўна рыхтавалася да Новага году, пісьменнікі Прынямоння правялі чарговую творчую сустрэчу ў Гудзевіцкім дзяржаўным літаратурна-краязнаўчым музеі. Выступаць у музеі напрыканцы снежня здавён стала добрай традыцыяй. Асабіста я прымала ўдзел у сустрэчы другі раз. З вялікім нецярпеннем чакала гэтага дня, бо наведаць Гудзевіцкі музей – гэта ўсё роўна, што апынуцца ў дзяцінстве і адчуць прыемны пах бабулінай хаты.

Як заўсёды, кіраўніцтва музея вітала гасцей з адметнай радасцю. Пасля прывітальных слоў нас запрасілі на экскурсію ў новую залу. 23 снежня ўва ўстанове адбылося адкрыццё новага раздзела экспазіцыі “Гісторыя роднага краю”. Падаецца, што памяшканне невялічкае, але колькі інфармацыі – на цэлы будынак: там і гісторыя вёскі, і фотаздымкі людзей, і асабістыя рэчы вяскоўцаў, і лісты з фронту, і нават вугалок школьніка. Што ні крок – цэлая гісторыя. Мы засталіся пад уражаннем.

Пасля экскурсіі госці накіраваліся ў залу для выступленняў, дзе нас ужо чакалі слухачы. Зала, канешне, чароўная. На сценах з усіх бакоў вісяць тканыя ручнікі, а там дзе ручнікі – там заўсёды адчуваецца цеплыня. Нездарма некалі нашы бабулі аздаблялі хаты ручнікамі, бо яны лічыліся асаблівым абярэгам унутранай спагады сям’і.

У складзе нашай дэлегацыі былі: старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Людміла Кебіч, член Саюза пісьменнікаў Таццяна Сучкова і кандыдаты на ўступленне ў Саюз пісьменнікаў – Ірына Салата і я – Вольга Алізар. Першай слова па традыцыі ўзяла Людміла Антонаўна. Яна павітала прысутных, павіншавала ўсіх з надыходзячымі святамі, а пасля мы пачалі выступаць.

Таццяна Сучкова – дзіцячая пісьменніца – прадставіла слухачам сваю новую кнігу “Как драник в масле катался”. У кнізе змешчаны невялікія апавяданні для дзяцей, але калі Таццяна Аркадзьеўна пачала расказваць пра

кнігу і пра кожнае апавяданне асобна, то, шчыра кажучы, стала цікава і тым дарослым жанчынам, якія прыйшлі на сустрэчу. Гісторыі настолькі непаўторныя і вясёлыя, што ў фінале выступлення Таццяны Аркадзьеўны ад смеху мы трымаліся за жываты і, мяркую, нагадвалі драніка, які катаўся ў масле. Потым пісьменніца паказала іншыя свае кнігі, якія прывезла з сабой і пачытала вершы пра песняроў – Янку Купалу і Якуба Коласа.

Ірына Аркадзьеўна – таксама дзіцячая пісьменніца – прадставіла слухачам сваю кнігу “Русалчына затока” і пачытала з яе казку пра тое, як Баба Яга пачынала новае жыццё. Вельмі цікавы твор і, я лічу, павучальны. Затым пісьменніца прадэманстравала іншыя свае кнігі і, самае захапляльнае, – пазнаёміла нас са сваімі лялькамі. Так, Ірына Аркадзьеўна захапляецца лялькамі і кожная яе лялька – гэта цэлая гісторыя і сапраўдны абярэг на кожны выпадак жыцця. На цёплы ўспамін яна падарыла кожнай з нас ляльку, зробленую з каляровай пражы.

Людміла Антонаўна таксама прыехала не з пустымі рукамі – яна прадставіла слухачам сваю новую дзіцячую кнігу “Як коцікі-брацікі малую радзіму шукалі” і зачытала невялікі ўрывак з яе. Гэта гісторыя, канешне, пра розныя цікавыя прыгоды коцікаў-брацікаў, але перш за ўсё гэта зварот да кожнага з нас, гэта заклік ведаць і шанаваць малую радзіму ад нараджэння. Лічу, што варта будзе пачытаць кнігу не толькі дзецям, але і дарослым. Таксама Людміла Антонаўна пачытала вершы – як заўсёды, яны былі напоўнены пяшчотай і ласкавасцю да ўсяго жывога. Па-іншаму ў паэткі не бывае.

Я, як і мае калегі, прыехала таксама з падарункамі. Спачатку я пазнаёміла слухачоў са сваімі кнігамі, якія выйшлі ў 2025 годзе: “У імя Перамогі” і “Я дачка сінявокай краіны”. Расказала, як яны ствараліся, якая галоўная тэма маіх твораў і, канешне, пачытала вершы. Акрамя кніг у падарунак музею прывязла вышыўку пад назвай “Калядны вечар”. Дарыць падарункі музею стала добрай традыцыяй і для мяне.

А разыначкай нашай творчай музейнай сустрэчы стала нараджэнне новага вобраза. Якога? У музеі мы натрапілі на лялек, якія ляжалі на лаўцы. Як сказалі супрацоўнікі музея, іх зрабіла майстрыха са сваімі вучнямі. Хто яна, гэтая лялька, было невядома, бо імя ёй яшчэ не прыдумалі. Ірына Аркадзьеўна, як добры спецыяліст па ляльках, сказала, што лялька без імя не можа існаваць. І тады Людміла Антонаўна прамовіла: ”Няхай гэта будзе Гудзявінка”. Гудзявінка!.. Усім вельмі спадабалася такая прапанова, і выйшла, што на нашых вачах нарадзілася новая гераіня. А мы, пісьменнікі, далі абяцанне да наступнай сустрэчы напісаць пра яе творы. Таму я больш, чым упэўнена, што казцы быць!

Вялікі дзякуй супрацоўнікам музея і слухачам за цёплую сустрэчу. Будзем спадзявацца, што ў хуткім часе сустрэнемся зноў.

**Вольга АЛІЗАР**
**вядучы спецыяліст**
**Гродзенскага абласнога**
**аддзялення СПБ,**
**паэтэса**

**На фота:** дэлегацыя гродзенскіх пісьменніц падчас наведвання Гудзевіцкага дзяржаўнага літаратурна-краязнаўчага музея. Мастоўскі раён. 30 снежня 2025 года.



З дырэктарам музея Таццянай Вітальеўнай Прудзілка



